БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 11 (93)
красавік
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.



Вялікдзень

12 красавіка – каталіцкі Вялікдзень

З ПАСТЫРСКАГА ПАСЛАННЯ НА ВЯЛІКДЗЕНЬ 2009

...Сёння мы ўсе спяшаемся ў нашыя прыгожа аздобленыя святыні, каб пад велічны перазвон званоў і ўзнёслы спеў "Хвала на вышынях Богу" святкаваць урачыстасць, якая з'яўляецца падмуркам нашае веры. Яшчэ святы Павел сказаў, што "калі Хрыстус не ўваскрос, дык марнае і прапаведаванне нашае, і вера наша марная".

Мы здольныя весці вялікія змаганні дзеля новых дасягненняў у навуцы і тэхніцы, у культуры і спорце, мы прыкладаем вялізнія намаганні дзеля спазнання таямніцаў жыцця, матэрыі, космасу... Але пры гэтым духоўныя справы ўсё часцей занядбоўваюцца і людзі ўдзяляюць ім усё менш увагі.

Уваскрослы Хрыстус праз служэнне Касцёла прыходзіць да нас і сілаю любові і ласкі яднае нашае жыццё са сваім і нас паміж сабою. Ахрышчаныя вернікі, якія жывуць праўдаю Уваскрасення, ужо больш не чужыя паміж сабою, бо іх яднае Езус Хрыстус. Падмурак нашага жыцця паўсюль той самы -- гэта Ўваскрослы Езус Хрыстус, у якім мы ўсе ўтвараем адно цэлае. І гэта не словы нашага сучасніка Біла Гейтса, які з дапамогаю Інтэрнэту зрабіў увесь свет падобным на адну вялікую вёску, але вучэнне самога Хрыста.

Ад усяго сэрца віншую вас з радаснай і збаўчай урачыстасцю Уваскрасення Хрыста! Даручаючы ўсіх вас апецы Марыі -- Маці Збаўцы і нашай духоўнай Маці -- праз Яе заступніцтва прашу Уваскрослага Езуса, каб нашае жыццё было прасякнута духам Пасхі -- гетага пераходу са смерці да жыцця, а мы самі былі людзьмі святла і глыбокай веры, поўнымі ўзаемнай любові. На шлях духоўнага ўваскрашэння ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца + і Сына, + і Духа + Святога. Амэн.

Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ,
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.



19 апреля – православная Пасха

ИЗ ПАСХАЛЬНОГО ПОСЛАНИЯ

...И вот ныне, пробудившись от греховного сна мы призваны, по слову Святого Евангелия, войти в радость Господа нашего и свидетельствовать пред Богом и людьми о том, что Христос воскрес! Воистину воскрес!

Торжество Жизни над смертью мы исповедуем в эти дни всеми силами нашей совести, которую мы постарались очистить постом и молитвой. И потому для нас становится весьма близким образ пробуждения от сна и переход к творческому бодрствованию.

Ныне настали времена, когда кризисные испытания настигли «новый мир», построенный человеком без Бога. Мир наживы и гордыни, корысти и безудержного потребления обманул своих обитателей. Задача мира христианского состоит в том, чтобы «камень, который отвергли строители» вновь «сделался главою угла».

Христос воскрес! Воистину воскрес! -- и нас воскресит силою Своею. Аминь.

ФИЛАРЕТ,
Митрополит Минский и Слуцкий,
Патриарший экзарх всея Беларуси.
Пасха Христова 2009 г.

С 8 по 16 апреля 2009 г. иудеи празднуют Песах.

Песах, или Пасха -- самый древний из еврейских праздников. Связан он со становлением еврейского народа, поэтому одно из названий -- «Время нашей свободы».

Праздник Песах берёт начало в истории Исхода евреев из Египта. Как известно. Всевышний повелел Моисею отправиться в Египет и вывести евреев из рабства. Но фараон не пожелал отпускать своих многочисленных рабов, да и многие евреи сами не хотели выходить на свободу -- бросить пусть и тяжёлую, но привычную жизнь, скитаться по пустыне, уйти в неизвестность. Сам Исход из Египта произошёл очень быстро, в считанные дни, как «прыжок в бездну». И название Песах -- от корня «прыжок через...». Прыжок к свободе, к избавлению души народной от пут и преград.

Перед исходом люди даже не успели заквасить тесто, поэтому на пекли пресных лепёшек - мацу. И с тех пор маца -- «хлеб лишений» и «хлеб свободы» -- служит символом изгнания из рабства и символом освобождения. В этом и заключается важнейший урок: разница между свободой и рабством не в степени комфорта, а в праве распоряжаться собственной судьбой. *(«СБ», 8.04.09)*

Благодатный огонь

Гроб Господний

Согласно двухтысячелетием традиции, накануне Великой Субботы гасятся все огни в храме Воскресения Христова в Иерусалиме. В Великую Субботу, когда в России, Беларуси во всех храмах и монастырях освящаются куличи и пасхи, иерусалимский Патриарх в полдень приходит к Гробу Господню. После разоблачения (с него снимают митру, саккос и омофор) Патриарх входит в Святой Гроб с пучком из 33 незажженных свечей и совершает молитву. Через несколько минут, а иногда и часов, с неба нисходит Благодатный Огонь. Сначала он появляется в виде играющих бело-желто-голубых бисеринок на самом Гробе Господнем. В мгновение ока зажигаются лампады, стоящие на Ложе Спасителя. От Небесного Огня зажигает свечи Патриарх и передает его богомольцам, заполнившим храм. Этот огонь необыкновенный — первое время после чудесного схождения он совершенно не обжигает. И это чудо невещественного и неопалимого огня длится 10—15 минут. Люди «умываются» им, исцеляют больные места.

Весь храм в эти священные минуты находится в божественной стихии Пасхального Огня. Молния, роса, гром, необыкновенное благоухание, свежая прохлада, свечение икон — все это ежегодно видят тысячи паломников со всего мира.

Благодатный Огонь нисходит только по молитве православного Патриарха, что является одним из неопровержимых свидетельств божественного знамения истинности православной веры.

В далеком 1579 году иноверные решили завладеть Благодатным Огнем. Турецкие власти не допустили православных ко Гробу Господню. Они стояли и молились вне храма. Вместе с ними у колонны у входа в храм Воскресения Христова стоял православный Патриарх. В течение нескольких часов иноверные ожидали чуда на Святом Гробе, но напрасно. Благодатный Огонь был ниспослан православному Патриарху из колонны в виде молнии. До сегодня каждый паломник может лично убедиться в этом чуде: огромная трещина на колонне — молчаливый свидетель тому *(на снимке)*. И вновь, как 2 тысячи лет назад, в Великую Субботу весь мир затаит дыхание в ожидании чуда Благодатного Огня. И хотя мы будем находиться за тысячи километров от Святой Земли, пусть благодатный Огонь войдет и в ваши души, очистит, согреет и укрепит вас.

Иван Бунин

Христос воскрес!

Христос воскрес!
Опять с зарёю
Редеет
долгой ночи тень,
Опять зажёгся
над землёю
Для новой жизни новый день.
Ещё чернеют чащи бора,
Ещё в тени его сырой,
Как зеркала, стоят озёра
И дышат свежестью ночной.
Ещё в синеющих долинах
Плывут туманы... Но смотри:
Уже горят на горных льдинах
Лучи огнистые зари!
Они в выси пока сияют,
Недостижимой, как мечта,
Где голоса земли смолкают
И непорочна красота.
Но, с каждым часом приближаясь
Из-за алеющих вершин,
Они заблещут, разгораясь,
И в тьму лесов, и в глубь долин
Они войдут в красе желанной
И возвестят с высот небес,
Что день настал обетованный,
Что Бог воистину воскрес!

О посещении кладбища в день Пасхи

Церковный Устав не запрещает в этот день навестить родную могилку. В день Пасхи можно посетить кладбище, чтобы похристосоваться с усопшими. Христосование должно быть действительно радостным христосованием, а не заупокойным молением, всегда настраивающим нас на грустный лад. Церковные люди скажут на дорогой могилке: «Христос воскресе!», положат на могилку красное яичко, может быть, и поплачут, но совершать заупокойную службу не дерзнут.

Служение же панихиды откладывается до Радуницы, до вторника второй недели после Пасхи, когда совершается пасхальное поминовение усопших.

Пасхальные приметы

Существовало убеждение, что всякий, кто умрёт в Светлую седмицу, беспрепятственно попадёт в рай, какой бы грешник он ни был, потому что в пасхальную неделю врата рая не закрываются и их никто не охраняет.

На Пасху небо ясное и солнце играет -- к хорошему урожаю и красному лету.

На Святой недели дожди -- добрая рожь.

Коли дождь или непогода в первый день Пасхи, так и весна дождлива будет.

Если на второй день Пасхи будет ясная погода -- лето будет дождливое, если пасмурно -- сухое.

УРЭШЦЕ!

Чытачы “Брылеўскага летапісу” памятаюць гэту вось аб’яву наконт тых бетонных жолабаў, што ляжалі пад Домам культуры. Іх сюды прывезлі, каб рабіць цеплатрасу. Але трубы праляглі не пад зямлёй, і гэтыя бетонныя карыты далі прытулак дзіцячым гульням (шчасце, што ніхто тут нічога сабе не вывіхнуў і не паламаў!) і ўсім мясцовым (і не толькі) выпівохам. А што, зручна: выходзіш з крамы, сядаеш, раскладваешся, наліваеш, ад Дома культуры музыка гучыць -- чым не кафэ?.. Усё б нічога, але пасля такіх пасядзелак заставаліся скірды смецця і бітага шкла. А гэта ўсё-ткі самы цэнтр Брылёў. Непарадак!.. Так цягнулася амаль тры гады. І было шмат абяцанняў ад розных начальнікаў паспрыяць ліквідацыі гэтага рассадніка. У жніўні 2007 года нехта, відаць, адгукнуўся на нашу аб’яву -- і частку жолабаў (што панавей) пацiху звёз. А два дабітых бетонных цуды так сіратліва і ляжалі. І літаральна днямі зніклі і яны -- знайшліся добрыя людзі і дапамаглі вырашыць гэту амаль невырашальную праблему. Дзякуй ім вялікі за гэта!

Ліпень 2006 г.

23.08.2007 г.

9.04.2009 г.

На суботнік!

11 красавіка 2009 года ў Брылях адбыўся традыцыйны веснавы суботнік. Раней ён называўся камуністычным і рабіўся напярэдадні 22 красавіка -- дня нараджэння правадыра сусветнага пралетарыяту У. І. Леніна. А зараз гэтае свята працы звычайна пападае акурат перад красавіцкімі рэлігійнымі святамі, -- сёлета гэта адбылося напярэдадні каталіцкага Вялікдня, які святкуецца 12 красавіка. Таму настрой на самой справе святочны -- трэба ж перад вялікім днём прыбрацца ды прыхарошыцца!...

На працу выйшлі ўсе разам -- кіраўнікі і работнікі выканканкама Брылеўскага сельсавета, настаўнікі і выхавацелі школы-сада, культработнікі Дома культуры, паштальёны адзялення сувязі, прадстаўнікі мясцовага гандлю. Зграбалі мінулагоднее лісце, збіралі і выносілі смецце, бялілі дрэвы і бардзюры. А дружны атрад мясцовага ўчастка ЖКГ пад кіраўніцтвам А.М.Сілкова займаўся пасадкай малодзенькіх бярозак каля дамоў па вуліцы Юбілейнай...

Вядома ж, раней, калі быў яшчэ калгас імя Ільіча, у такія дні было і шматлюдней, і гаманлівей. Але і сёння хвалі добрага настрою накрылі веснавой хваляй усіх тых, хто выйшаў працаваць не за грошы, а дзеля таго, каб на роднай зямлі было ўтульна і прыгожа жыць.

Мікола ЯЦКОЎ.

У.І.Мажораў

Н.І.Рамашкевіч

Настаўнікі ля помніка аднавяскоўцам

В.М.Мяшкова

Т.М.Васюрэнка

І.Ф.Пракопчык

Т.Ф.Прудзікава

Ля аддзялення сувязі -- Л.А.Парфененка

Ля Дома культуры - І.З.Дудар і А.М.Яцкова

Добра-ахвотнік А.А.Бу-лаўскі

Пасадка дрэў: М.А.Карнееў, У.А.Іваноў, А.Г.Мяшкоў, В.У.Вараб'ёў і Л.А.Баранаў

Расці вялікай, бярозка!..

Фотаздымкі Міколы Яцкова

А.У.Смяшкова

Ля магазіна -- М.С.Чугаеў

Вясна, Масква і двайнікі

Кожнае падарожжа аднекуль пачынаецца. Для Людмілы Іларыёнаўны Маркавай яно пачалося ў брылеўскім аддзяленні сувязі ў момант набыцця там рулончыка фотаплёнкі. Плёнка тая нырнула ў фотаапарат, і ў пятніцу 10 красавіка ўся гэта тэхніка разам з Людмілай апынулася ў Маскве -- у гасцях ў брата Валерыя Іларыёнавіча. Трэба сказаць, што В. І. Елін -- чалавек у Маскве вядомый: падпалкоўнік авіацыі запаса, начальнік падатковай інспекцыі аднаго з маскоўскіх раёнаў. Ён і запрасіў Людмілу прыехаць на дзень-два да яго ў госці. Думаў павазіць яе па сталіцы на аўтамабіле, але Людміла захацела і метро паглядзець, і больш пешшу пахадзіць. І хоць часу на гарадскую вандроўку было зусім мала -- няпоўны дзень -- але ўражанні засталіся вялікія. Вось што расказала сама Людміла: *"Вялікі горад! Але людзей зусім не відаць -- у метро едуць, а наверсе адны машыны. На Краснай плошчы заўважыла чалавека ў нейкім дзіўным выглядзе -- у шынелі, з ордэнамі. Пытаюся ў Валеры: "Што гэта за дзівак такі?" Кажа: "Дык гэта ж цар Мікалай Другі -- двайнік". Прыгледзелася -- сапраўды, падобны. Павярнулася -- ой ты, Божа ж мой: сам Ленін падыходзіць! Ну не адрозніш! Прапанавалі з імі сфатаграфавацца, але ж пяць долараў за здымак -- усё-ткі занадта... Зайшлі мы і ў ГУМ, які насупраць Крамля, прайшліся па цэнтру. І хоць надвор'е было троху халаднаватае, але было сонечна, і настрой быў адпаведны -- веснавы".*

А мы маем магчымасць праз гэтыя фоткі ўбачыць некалькі маскоўскіх імгненняў. **М.Я.**



Красная плошча, Спасская вежа



Валерый і Людміла ля Маўзалея

Вось яны -- правадыр пралетарыяту і апошні расейскі імператар.

Ля помніка Юрыю Нікуліну



Ля фантана ў цэнтры ГУМа

ЗВЯЗДА

красавік 2009 г.

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

БЕЛЫ ТЫДЗЕНЬ

Апошнія шэсць дзён перад Вялікаднём пазначаны статусам асаблівай павагі. Першыя дні тыдня былі прысвечаны навядзенню парадку спачатку на абшарах сядзібы, а затым ужо ў хаце, таму гэтыя дні называлі "чыстыя": Чысты панядзелак, Чысты аўторак, Чысты чацвер.

● У Чысты ***панядзелак*** пачыналі наводзіць парадак у двары, каля гумна, хлява, адусюль выграбалі мінулагоднее смецце. Абавязкова прыбіралася ў садзе, спальвалі або закопвалі старое лісце і сухое галлё. Менавіта ў гэты дзень бялілі хату і дваровыя пабудовы. Наводзілі парадак і ў хляве: чысцілі хатнюю жывёлу, выкідвалі гной.

● У ***аўторак*** пачыналі наводзіць парадак у хаце. Усё хатняе начынне выносілі, перасушвалі, выбівалі пыл, вымывалі вокны, вымяталі з усіх закуткоў смецце, бялілі печ, абавязкова мылі бялізну.

● У ***сераду*** трэба было вымыць усё драўлянае: дзяжу, хлебную лапату, выскрабалі сталы, лавы і г.д.

ЧЫСТЫ ЧАЦВЕР

● Сярод беларусаў і сёння жыве звычай у ноч з серады на чацвер "рыхтаваць" чацвярговую соль, або соль "на сямі вятрах". Сальнічку са звычайнай соллю ў сераду перад захадам сонца ставілі на адкрытым месцы: на клад дроў, на стог сена або проста пад застрэшак. За незвычайную ноч яна ўцягвала ў сябе энэргію сонца, месяца, зор, паветра і набывала незвычайныя гаючыя і ахоўныя якасці. На працягу года асвечанаю такімі спосабамі соль выкарыстоўвалі ў самых розных сітуацыях як самы моцны абярэг і цудоўны лекавы сродак.

● У Чысты чацвер на двор выносілі асвячаць ваду і мыла ("Мылам у чацвер да сонца мыюцца ў лазні, каб быць чыстымі цэлы год"). Людзі былі глыбока перакананы, што Чысты чацвер "змывае" усе грахі і хваробы на цэлы год, таму асноўным рытуальным дзеяннем раніцы гэтага дня было купанне (у самых розных яго праявах).

● У Чысты чацвер вернікі пасля ранішняга набажэнства неслі запаленыя свечы дадому. Калі па дарозе да дому чалавек змог захаваць полымя свечкі ад ветру і прынесці запаленую свечку ў хату, лічылася, што ўвесь год у гэтай сям'і будзе ўдалым.

● У Чысты чацвер нікому нічога не пазычалі, асабліва полымя. Лічыцца, што той, хто просіць у гэты дзень, мае дрэнныя намеры.

● У Чысты чацвер нельга вадой гасіць полымя: "грэх жыццё ў яго адбіраць, бо гэты дзень і для агню важны".

● У Чысты чацвер раілі сеяць расаду капусты.

ЧЫРВОНЫЯ ПЯТНІЦА І СУБОТА

Пятніцу і суботу перадвелікоднага тыдня беларусы называлі Чырвонымі ад таго, што менавіта ў гэтыя дні фарбавалі яйкі і выпякалі пасху.

● У Перадвелікодную ***пятніцу***, дзень, калі быў укрыжаваны Хрыстос, беларусы трымаліся самага строгага посту (ужываць ежу дазволена было толькі пажылым, дзецям і хворым).

● У гэту пятніцу глядзелі на вуліцу праз вокны, прыкмячалі, каго ўбачаць першым:

-- калі мужчыну, гэта прадказвала поспех на тры месяцы;

-- калі сталую жанчыну, то тры месяцы будуць ісці па чарзе няўдачы з поспехамі;

-- калі маладую жанчыну -- тры месяцы пройдуць без складаных праблем;

-- калі сям'ю -- да міру ў сям'і, да прымірэння тых, хто пасварыўся;

-- калі сабаку -- да тугі; ката -- да прыбытку; птушку -- да новага знаёмства і добрых вестак;

-- інваліда -- да смерці блізкага чалавека.

● Лічыцца, што калі чалавек захварэў у Перадвелікодную пятніцу (трапіў у бальніцу), то хутка стане на ногі.

● Калі вы заўважылі, што ў вашай хаце робіцца штосьці дрэннае, то трэба ў Перадвелікодную пятніцу пайсці ў царкву і прынесці дадому недагарэўшую свечку, якая была ў вас у час набажэнства. Дома запаліце яе і абыдзіце ўсе пакоі: там, дзе свечка пачне моцна трашчаць, вы знойдзеце нейкую рэч, якая звычайна і з'яўляецца сурочанай.

● У Вялікую ***суботу*** самай галоўнай і адказнай справай было фарбаванне яек -- сімвала Вялікадня.

● Увесь дзень да вечара ў цэрквах асвячаюць спецыяльныя велікодныя стравы. Іх уладкоўваюць на ручніках (абрусах), у куліч ставяць свечку, якую запальваюць перад пачаткам асвячэння. Адно з яек неабходна напалову абабраць, каб на яго трапіла асвечаная вада: "каб святасць лепш прайшла".

● Ручнік, на якім вы асвячалі куліч у час велікоднага набажэнства, добра дапамагае ад сурокаў, калі насіць яго на сабе.

● Калі не спаць ноч на Вялікдзень, вы будзеце захаваныя ад хваробаў, забяспечыце сабе шчаслівы шлюб, багаты ўраджай і поспех.

● Калі на ўсяночнай на Вялікдзень моцна трашчаць свечкі ў царкве, лета будзе з дажджом, з частымі градамі і маланкамі. Дождж у велікодную ноч абяцае халоднае лета, а ціхае цёплае надвор'е -- цёплае лета.

ВЯЛІКДЗЕНЬ

● У народзе хадзілі чуткі, што ад Велікадня да Ўшэсця Ісус прыходзіць на зямлю ў выглядзе жабрака, ён ходзіць па вёсках, заглядае ў вокны, глядзіць, хто і як святкуе светлы дзень -- Уваскрэсенне. Таму ў гэты дзень жабракоў, бяздомных, юродзівых абавязкова запрашалі ў госці, раздавалі міласціну.

● Лічылася, што калі на Вялікдзень у хаты прыйдзе чужы чалавек і сядзе за святочны стол, то на працягу года гэтай сям'і будзе шанцаваць ва ўсіх справах.

● Раніцай, пасля вяртання з храма, кармілі курэй, насыпаўшы зерне ў сярэдзіну загадзя знятага з бочкі абруча - пасля гэтага ні адна курыца не знясе яйкі ў суседа або на дварэ.

● На Вялікдзень дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту варажылі -- скакалі цераз сані: тая, якая пераскочыць, у гэтым годзе пойдзе замуж.

● Лічылася, што той, хто народзіцца ў дзень святкавання Вялікадня, будзе няшчасным.

● Старыя людзі раілі абавязкова на Вялікдзень зрабіць сем добрых спраў і падараваць сем падарункаў. На працягу ўсяго года, да наступнай Пасхі, Бог будзе памятаць вашу шчырасць і дабрыню.

● На Вялікдзень і на працягу ўсяго пасхальнага тыдня катэгарычна з абаранялася ў кагосьці што-небудзь прасіць і каму-небудзь штосьці пазычаць.

● Пакуль не завяршыўся Пасхальны малебен, у вёсцы не дазваляліся ніякія танцы, гульні, уцехі і забавы моладзі, забаранялася крычаць, гаварыць благія словы.

● У першы Велікодны дзень у госці не хадзілі, а вось на другі і трэці трэба было абавязкова адведаць блізкіх сваякоў.

● Тры шкарлупіны ад свянцонага яйка зашывалі ў чырвоную тканіну разам з чацвярговай соллю і ўвесь год насілі пры сабе як самы лепшы абярэг.

● Калі на Вялікдзень яснае, няхай і халоднае надвор'е, то пладовыя дрэвы прынясуць цудоўны ўраджай.

Старонку падрыхтавала бібліятэкар Брылеўскай сельскай бібліятэкі Ала ЯЦКОВА

Прозвішча падпісчыка

Віншуем!

У Кірыла Міхайлавіча Куляшова -- свята.
22 красавіка яму спаўняецца 10 год.
Ён з’явіўся на свет ў 1999 годзе, у самым канцы
XX стагоддзя, і заўсёды будзе ганарыцца тым,
што нарадзіўся на стыку не толькі двух вякоў,
але і двух тысячагоддзяў.
З Днём нараджэння, Кірыл! З Юбілеем!

ШАШКІ І ГЭТА ЦІКАВА!

Валянціна Макараўна Мяшкова, Карына Паршнёва, Надзея Журава, Карына Бірукова, Яна Пшанічная і Яна Какоўка.
13 сакавіка 2009 г.

Валянціна Макараўна Мяшкова кіруе шашачным гуртком у Брылеўскай пачатковай школе. Аддаўшы амаль сорак гадоў педагагічнай дзейнасці, Валянціна Макараўна ўпэўнена ў тым, што фізічная загартоўка вучняў павінна спалучацца з інтэлектуальнымі набыткамі. А трэнінг для розуму дае менавіта гульня ў шашкі, -- на першы погляд такая простая і не складаная. Ўдзельнікі школьнага гуртка, акунаючыся ў гэты цікавы сусвет, зноў і зноў знаходзяць пацвярджэнне словам свайго кіраўніка.

Брылеўскія нябёсы

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь
для жыхароў Брылеўскага рэгіёна
і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2009

Заснавальнік
і рэдактар
Мікола
ЯЦКОЎ